**В. Ф. ПАДСТАЎЛЕНКА,**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
дацэнт УА «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава»

# МАСТАЦКАЯ СПЕЦЫФІКА І РОЛЯ ПЕЙЗАЖУ Ў КАЗАЧНАЙ ПРОЗЕ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

УДК 821.161.3-343.4:7.047

**Мастацкі свет у казках Уладзіміра Караткевіча — з'ява шматгранная і markазнабаковая. Арыентуючыся на выпрацаваныя стагоддзямі жанравыя каноны народнай казкі, класік істотна пашырыў яе змест і форму. Творчы падыход да жанру адбіўся і на спецыфіцы прыродаапісанняў у казачных творах Караткевіча.**

**Пейзаж у аўтарскіх казках упершыню разглядаецца як істотны кампанент караткевічаўскай мадэлі беларускага нацыянальнага свету і як адметны прыклад творчай арыентацыі на традыцыі рамантычнага мастацтва.**

***Ключавыя словы:*** **казка; Уладзімір Караткевіч; пейзаж; рамантычнасць, мастацкая прастора; прыродны свет.**

**The artistic world in Uladzimir Karatkevich's fairy tales is a complex and multidimensional phenomenon. By relying on the time-honored genre conventions of the folk tale, the classic author profoundly enriched both its content and form. Karatkevich's creative approach to the genre is also evident in the distinctive character of nature imagery in his fairy-tale work.**

**The landscape in Karatkevich's original fairy-tales is examined for the first time as a significant component of his model of the Belarusian national worldview and as a distinctive example of creative orientation toward the traditions of Romanticism.**

***Keywords:*** **fairy tale; Uladzimir Karatkevich; landscape; Romanticism; art space; natural world.**

## Уводзіны

Традыцыйна пейзажныя замалёўкі ў народных казках разглядаюцца як другарадныя элементы, яны быццам з'яўляюцца чымсьці малазначным і не маюць істотнага мастацкага значэння. Аднак, як засведчылі працы Т. І. Шамякінай [3], А. І. Бельскага [1], З. У. Драздовай [2] і іншых даследчыкаў, немагчыма дасягнуць належнай літаратуразнаўчай аб'ектыўнасці без аналізу разнастайнай мастацкай функцыянальнасці пейзажных апісанняў у творы.

Падобнае меркаванне — наконт другаснасці пейзажных малюнкаў — таксама часам прысутнічае ў даследаваннях лепшых узораў і прыкладаў мастацкай літаратуры, у прыватнасці — аўтарскіх казак Уладзіміра Караткевіча. Але самабытнасць яго творчага дыскурсу ярка праяўляецца ў кожным элеменце мастацкага свету пісьменніка. Гэта асабліва выразна бачна ў пейзажных дэталях, арганічна ўключаных у хранатоп казак. Сінтэтычнасць казачных твораў У. Караткевіча выяўляецца ва ўменні аўтара спалучаць розныя мастацкія элементы, у тым ліку пейзажныя апісанні, што ўзбагачае іх тэматычную і сэнсавую глыбіню. А. М. Ненадавец слушна адзначае наконт Караткевіча-казачніка: «ад міфічна-фантастычнага, казачна-фальклорнага разумення прыродных з'яў, самой маці-прыроды аўтар вельмі лёгка пераходзіць

да рэальнасці, але, зноў-такі, сплеценай з гісторыяй, мінулым» [4, с. 51].

Вывучэнне асаблівасцей прыродаапісанняў у творах У. Караткевіча павінна якасна дапоўніць матэрыял, рэпрэзентаваны ў грунтоўных манаграфіях А. Л. Вераб'я [5], А. В. Мальдзіса [6], А. У. Русецкага [7], В. К. Шынкарэнка [8], Я. А. Гарадніцкага [9] і інш., а таксама ў энцыклапедычным выданні «Уладзімір Караткевіч» [10].

## Асноўная частка

Кожны твор Уладзіміра Караткевіча сведчыць пра шчырае захапленне аўтара беларускім светам, які, нібы дыямент, зіхаціць у яго спадчыне незабыўнымі гранямі і непаўторнымі фарбамі. Для пісьменніка-патрыёта кожная з намаляваных карцін — звышважная. Караткевіч умеў пераканаць, што нават у самым звычайным на Бацькаўшчыне хаваецца дзівоснае, цудоўнае, неверагоднае, і што нам, беларусам, пашчасціла нарадзіцца на такой казачнай зямлі.

Адпаведнай эмацыянальна-сэнсавай накіраванасцю вызначаюцца ўсе пейзажныя штрыхі ў аўтарскім казачным хранатопе. Пры гэтым кожная прыродная замалёўка ў Караткевіча выглядае неабходнай для поўнага і дакладнага разумення твора. Больш за тое, пейзажныя элементы набываюць важныя сэнсавыя канатацыі, што непасрэдна звязана з ідэйным зместам казачнага свету пісьменніка. У. Караткевіч сцвярджае ідэю непарыўнай сувязі паміж пакаленнямі беларусаў і нацыянальнай ментальнасцю, якая выступае надчасавай асновай духоўных, грамадзянскіх і маральных каштоўнасцей народа. Дзякуючы шырыні і глыбіні мастацкага бачання Караткевіча, рэцыпіент выразна адчувае, што беларускі нацыянальны характар фарміраваўся пад уплывам працяглай у часе плыні жыцця — як быційнага, так і побытавага. Значную ролю ў гэтым працэсе адыгралі розныя фактары, у тым ліку і непаўторная прырода роднага краю, якая ўплывала на фарміраванне нацыянальнага характару, беларускай карціны свету.

Пейзажны кампанент сустракаецца фактычна ва ўсіх казках У. Караткевіча. Аднак у некаторых творах прыродныя апісанні набываюць асаблівую значнасць і адметнасць. На асобных прыкладах спынімся больш дэталёва.

У казцы «Вужыная каралева» цэнтральныя падзеі падаюцца так, што свет прыроды займае асноватворнае месца, а ўсе дзеянні і рашэнні персанажаў нібыта прадвызначаюцца вышэйшымі зямнымі сіламі і стыхіямі. Гэтыя сілы пастаянна выпрабоўваюць маральныя якасці герояў, іх каштоўнасны патэнцыял і, у рэшце рэшт, прадвызначаюць лёс персанажаў.

Для Караткевіча ўсё існае ў Сусвеце ўспрымаецца як адзіная прастора, якая складаецца з аднолькавых па значнасці лакацый. Яны надзелены лімінальнымі (прамежкавымі) уласцівасцямі і становяцца ключавымі пунктамі на жыццёвым шляху галоўных герояў. Гэта ідэя паслядоўна раскрываецца ў творы, у тым ліку праз апісанне як «нашага», чалавечага, так і вужынага светаў. Так, напрыклад, у «нашым» свеце прыродныя сілы пастаянна апекавалі галоўную гераіню Яліну: «Расла дзяўчынка: крыніцы ёй ваду давалі, завірухі румянілі, сонейка саграваліа. Расла і выраўнялася ў красуню, якой нат у нашых лясах не знайсці, не адшукаць. Статная, як яліна, вочы, як бездань блакітная, валасы залатыя, вусны чырвоныя» [11, с. 573].

Пейзаж у антысвеце Вужынага караля аўтар увасабляе як містычную прастору, пазбаўленую жыццёвасці і гармоніі: «І пасяродку гэтага царства мёртвага, бязлюддзя суровага стаіць палац закінуты з дзевяццю вежамі, а вакол яго па ставу нячутна плаваюць чорныя лебедзі. І ўсё як быццам сон здушыў: ціха, як на могілках» [11, с. 575]. Гэта месца пакут нават для яго ўладара: «Цемра ў ім, багна на яго дыхае, сонца сюды не зазірае. Ах як цяжка жыці сярод камянёў балотных» [11, с. 575]. Існаванне тут падаецца змрочнай ілюзіяй зямнога жыцця — трагічнай наканаванасцю для кожнага, хто сюды трапляе. У гэтай сувязі варта адзначыць, што падрабязней пра энігматычнасць і гатычны рамантызм Вужынага каралеўства гаварылася ў адным з нашых ранейшых артыкулаў [12].

Шматсэнсавыя вобразы Яліны і яе дзяцей у творах Караткевіча выступаюць як лімінальныя стварэнні, маргінальнасць якіх узнікае на стыку не толькі чалавечых і прыродных імператываў, але і «антычалавечных», вужыных. Пасля перажытых драматычных падзей героі казкі цалкам выяўляюць сваю сутнасць, што падкрэсліваюць фінальныя словы Яліны: «Дык станьце ж вы тым, кім у

жыцці былі. Хто моцны быў — той хай такім і будзе, слабы — хай так і застанецца слабым. І я з вамі разам, як маці, стану» [11, с. 579]. Такім чынам, прырода ў «Вужынай каралеве» — не проста яркі фон сюжэтнага разгортвання, а перш за ўсё дакладна прадуманая аўтарам сімвалічная прастора, у якой праз знешнія абставіны адбываецца раскрыццё «самасці» герояў і іх сутнасная ініцыяцыя — духоўныя выпрабаванні, унутраны рост.

Адметную ролю пейзаж адыгрывае і ў казцы «Лебядзіны скіт». Сюжэт твора грунтуецца на моцным канцэптуальным канфлікце паміж жыццём і смерцю, патрыятызмам і здрадай, гуманізмам і эгаізмам. Гэта канфліктная аснова вызначае асаблівасці іншых мастацкіх кампанентаў: ад антаганістычных цэнтральных персанажаў — святога старца і Батыя — да дынамічных пейзажных замалёвак. Сыноўняя любоў Караткевіча да Беларусі адбіваецца ў тэксце гэтага твора, дзе праз вітальную каларыстыку роднай зямлі, асветленай яркім сонцам, упрыгожанай зялёнымі лясамі і блакітнымі азёрамі, аўтар стварае непаўторную атмасферу. Жыццядайныя фарбы непасрэдна звязаны са спрадвечнымі культурнымі кодамі Беларусі. Аўтар папярэджвае, што зразумець прыгажосць беларускіх краявідаў здатны толькі народ сваёй зямлі. Для чужынцаў, напрыклад Батыя, наша тэрыторыя — гэта ўсяго толькі страшная «балотная Русь», дзе жывуць «лягушатнікі». Адсюль вынікае і жаданне хана знішчыць усё на ёй: «Даўным-даўно дзень аднойчы ўзышоў не ў сонечным святле, а ў зараве пажараў, і чорная копаць панеслася на захад» [11, с. 566]; «Наперадзе яны сустракалі зялёныя палі, хаты ў садах і стракатыя гарады, а ззаду пакідалі толькі чорную пустэчу, па якой як жадаў хадзіў вецер, узнімаючы слупы попелу. І болей нічога не заставалася на калісьці зялёнай зямлі. Хмарамі няслiся стрэлы, пыл гарадоў дасягаў неба, <...> і няма каму было плакаць над руінамі, бо ўся пустая стаяла зямля» [11, с. 566—567]. З гэтых пейзажных карцін становіцца відавочнай дэструктыўная сутнасць хана як носьбіта і сімвала смерці.

Разважаючы ў «Лебядзіным скіце» пра беларускую ментальнасць, пісьменнік з гонарам адзначае здольнасць нашай нацыі вытрымаць любы выклік лёсу і выжыць у самых катастрафічных умовах-абставінах гісторыі. Для большай мастацкай выразнасці гэта ідэя перадаецца аўтарам праз асацыятыўны паказ вымушанага пераўтварэння роднай прыроды: яе знішчэння чужынцамі, часовага амярцвення і хуткага жыццядайнага аднаўлення («Падымуцца вашыя хаты, і кветкі пакрыюць пажар» [11, с. 571]). Пасля асноўных трагічных падзей фінал казкі выглядае патэнцыйна аптымістычным, жыццесцвярджальным: «Камень ляжаў нерухомы, точачы бясконцыя слёзы, а над каменем, над возерам, над пушчаю безупынку кружлялі белыя лебедзі.

<...> Яны (хан з войскам. — *В. П.*) пакідалі балотную зямлю, а за імі быццам вішні асыпалі лугі белым пухам сваіх кветак. Прызыўна трубілі лебедзі, кружлялі, падалі на ваду, і ў крыках іх гучала радасць» [11, с. 572]. У казцы адбываецца неверагоднае, і Радзіма-Бацькаўшчына працягвае жыць. Варта адзначыць, што магічнае і чароўнае ў творы ўзнікаюць не як традыцыйны элемент жанру, а як вынік дамінавання існых каштоўнасцей, асабліва маральных і грамадзянска-патрыятычных поглядаў станоўчых герояў.

Неабходна яшчэ раз падкрэсліць: патрыятызм Уладзіміра Караткевіча — з’ява ўсёахопная і ўніверсальная. Гэта пацвярджае і твор «Лебядзіны скіт», дзе традыцыйны беларускі пейзаж напаўняецца асаблівым сэнсам. Нават метафарычныя вобразы беларусаў — белых птушак, што ляцяць над роднай зямлёй, — могуць успрымацца як сімвал нашай ментальнасці, якая праяўляецца ў свабодалюбнасці, высакароднасці, духоўнай прыгажосці народа. Гэта вобразнае ўвасабленне сугучнае па ідэйнай глыбіні багдановічаўскаму Страцім-лебедзю, «гордаму, моцнаму птаху».

З шэрагу навукова-крытычных крыніц, прысвечаных творчасці У. Караткевіча, вынікае, што сам пісьменнік нярэдка аспрэчваў відавочную сувязь сваіх твораў з рамантычнай парадыгмай. У такой сітуацыі, безумоўна, варта перадусім улічваць аўтарскую волю і самаацэнку. Аднак для аб’ектыўнага разумення маштабу творчасці Караткевіча неабходна звярнуцца да вытокаў яго творчых інтэнцый, якія тлумачаць шырыню мастацкага мыслення, складанасць і драматызм канфліктаў, вобразную яркасць яго персанажаў. Зварот Караткевіча да рамантычнай эстэтычнай сістэмы быў абумоўлены яго глыбокай зацікаўленасцю тэмамі Жыцця, Кахання і Чалавечнасці. Гэта знаходзіць пацверджанне ў многіх творах рознай жанравай прыналежнасці, у тым ліку ў аўтарскіх казках.

На фоне дамінавання легендарна-міфалагізаванай нарацыі ў казачнай прасторы У. Караткевіча адметна вылучаецца твор «Ноч». У яго сюжэтнай арганізацыі і вобразным складзе выразна прасочваецца ўплыў сусветных рамантычных традыцый. Пад гэтым уплывам нават эскізна пададзеныя падзеі і персанажы набываюць сімвалічную значнасць і ўспрымаюцца як асноўныя мастацкія кампаненты твора на памежжы жанраў, якія пераносяць свой сэнсавы змест у сферу міфалагічнага ўніверсалізму. У казцы Караткевіч часткова абапіраецца на мадэль касмаганічнага міфа, у межах якога ён арыгінальна інтэрпрэтуе змену дня і ночы, раскрывае характар іх узаемадзеяння і паказвае стаўленне Сусвету да чалавечай супольнасці.

У названым творы чытача прываблівае арыгінальная персаніфікацыя цэнтральнага персанажа: «Скача ноч над зямлёю на чорным кані. <...> І твар у ночы чорны, на чорных валасах чорная карона і на юнацкім целе чорныя латы. Спіце, людзі, вартуе ноч верна ваш сон» [11, с. 590]. Ноч у творы паўстае загадкава-таямнічым юным вершнікам, чорным каралевічам, нябачным рыцарам-ахоўнікам усіх людзей. Такое вобразнае ўвасабленне відавочна адрозніваецца ад пашыранай у народнай фалькорнасці вобразнай мадэлі казачнай ночы, якая, нібы добрая маці, закалыхвае свет у сваёй пяшчоце і добразычлівасці.

Адзначым, што ва ўсходнеславянскім казачным кантэксце былі прэзентаваны толькі адзінкавыя прыклады вобразаў, вонкава падобных да караткевічаўскага персанажа, напрыклад, у літаратурна апрацаваным А. М. Афанасьевым творы «Васіліса Прыгожая». Тут гераіні эпізадычна трапляецца чорны вершнік на чорным кані як алегорыя ночы. Але блізкасць персанажаў абмяжоўваецца толькі супадзеннем іх агульнай вобразнай мадэлі. У народнай казцы адсутнічае ўся характарыстычная інфармацыя пра вобраз ночы: яго трагічную сутнасць, дабратворную для чалавецтва месійнасць і інш.

Небеспадстаўна можна сцвярджаць, што галоўны вобраз, створаны У. Караткевічам, уяўляецца досыць арганічным у еўрапейскім мастацкім кантэксце і адлюстроўвае тыповыя рысы рамантычнай літаратуры. Параўнальна-тыпалагічныя паралелі можна знайсці, напрыклад, у спадчыне Р. Л. Стывенсана, у якога ёсць верш «Начны вершнік» («Бурная ноч»):

Калі схаваны месяц, зоркі,
Паўсюль шалее люты вецер,
Усю ноч наскрозь у цемры золкай
Чуваць, як скача вершнік недзе
(пераклад наш. — *В. П.*) [13].

Мастацкія дыскурсы абодвух згаданых аўтараў, нягледзячы на жанравыя адрозненні тэкстаў, маюць шэраг агульных рыс: іх творы грунтуюцца на вонкавым дынамізме і метафарычных прасторавых уяўленнях, дзе дамінуюць ідэі ўсеагульнага адзінства і дыялектыкі палярных пачаткаў Быцця.

У творчым уяўленні аўтараў-рамантыкаў ноч часта атаясамлівалася не са спакоем і гармоніяй, а з лёсавызначальнымі пошукамі, адкрыццямі і ўнутранымі перажываннямі. Таму ў творах пра вандроўкі героя ноч паўстае як звышэкспрэсіўны і хутказменлівы час, як нязведаны шлях спазнання свету і самога сябе. Рамантычны вобраз персанажа ў творах Караткевіча не патрабуе дадатковага абгрунтавання: пра гэта сведчаць яго самабытнасць, адасобленасць, гераізм і гатоўнасць ахвяраваць сабой дзеля спакою і шчасця іншых.

Казка «Ноч» напісана лаканічна, з мінімумам падзей і персанажаў. Яна выглядае як істотны фрагмент у аўтарскай анталагічнай філасофіі, адным з цэнтральных імператываў якой выступае цыклічнасць быцця як умова яго вечнага абнаўлення і руху да лепшага. Канцэпцыя жыцця тут выразна аптымістычная: нават трагічна прадказальныя падзеі ў лёсе міфічнага Чорнага Вершніка — фатальная прадвызначанасць яго шляху, параза ў змаганні з сонечным святлом — разглядаюцца як неабходны этап, што вядзе чалавецтва да непазбежных перамен, да ясных і шчаслівых дзён, што паўтараюцца ў вечным рытме часу.

Барацьба супрацьлеглых пачаткаў і з'яў у казцы ўвасоблена як змаганне святла і цемры, пачатку і канца. Гэта стварае сюжэтную дынаміку, фарміруе духоўны шлях героя-пратаганіста і набліжае яго да ўсеагульнага спазнання жыцця.

У пошуках вытокаў самабытнага караткевічаўскага дыскурсу варта звярнуцца да паэтыкі сімвалістаў, дзе галоўны акцэнт рабіўся на падзейнай містычнасці і «на пашырэнні мастацкай уражлівасці» (Д. С. Меражкоўскі). Праз мастацкі сімвал у тэксце твора «мігаціць» новы сэнс. У сімвалістаў прырода не была проста намінатыўным фонам, а выступала асацыятыўным увасабленнем філасофіі жыцця аўтара і галоўных герояў, адлюстроўваючы

маральна-этычны і дзейнасна-валявы складнікі іх характараў.

Асабліва прыкметныя паралелі паміж мастацкімі светамі У. Караткевіча і М. К. Рэрыха, сусветна вядомага мастака і мысляра. Пейзажы на карцінах Рэрыха вылучаюцца пазітыўнай, светлай настраёвасцю, глыбокім зместам і шматграннасцю сэнсаў, што адпавядае рамантычным імператывам мастацтва. Аналагічныя рысы светаўспрымання праяўляюцца ў пейзажах У. Караткевіча. Гэты погляд з'явіўся праз пільнае назіранне за прыродай, навакольнымі з'явамі і непасрэднасць адчуванняў, гэты вопыт беларускі аўтар атрымаў яшчэ ў дзяцінстве і беражліва захоўваў на працягу ўсяго жыцця.

Вяртаючыся да асобы Рэрыха, адзначым, што ў 1939 годзе ім быў напісаны нарыс «Нябеснае дойлідства», у якім раскрываюцца асновы яго ўсёахопнай рамантычнай канцэпцыі. У прыватнасці сцвярджаецца, што «людзі відавочна падзяляюцца на два віды. Адны ўмеюць радавацца нябеснаму дойлідству, а для другіх яно маўчыць, ці, дакладней, сэрцы іх маўчаць. Але дзеці ўмеюць радавацца аблокам і ўзвышаюць сваё ўяўленне. Бо ўяўленне наша — толькі вынік назіральнасці. І кожнаму з першых дзён яго ўжо прадугледжана неперадавальная па прыгажосці сваёй нябесная кніга» [14].

Тут варта падкрэсліць яшчэ адзін важны тыпалагічны момант: героі-дзівакі, здольныя адчуць глыбіню і эстэтыку «нябеснага дойлідства», з'яўляюцца пастаяннымі вобразамі ў мастацкай прасторы У. Караткевіча. Пра гэта сведчаць яго творы «Чорны замак Альшанскі», «Ладдзя Роспачы», «Лятучы Галандзец», «Госць прыходзіць на золкім світанні». Адпаведныя вобразы нярэдка сустракаюцца і ў яго казках: святы старац з «Лебядзінага скіта», дух народнага музыкі Бан-Жвірбы са «Скрыпкі дрыгвы й верасовых пустэчаў», дзіўны Янка з «Чортавага скарбу», які ўмеў пасвіць аблокі.

Звернем увагу на яшчэ адзін цікавы факт: у мастакоўскай спадчыне М. К. Рэрыха ёсць карціна пад назвай «Вершнік ночы» (1918), галоўны герой якой, быццам мроя, імчыць у бязмежжы. У яго ўборы відаць штосьці падобнае на плашч, а на галаве вершніка ззяе карона. Гэты вобраз відавочна супадае з апісаннем героя-пратаганіста ў казцы Караткевіча. Можна заўважыць блізкасць сюжэтаў абодвух аўтараў-рамантыкаў, якія дасягаюць у творах містычна-фантастычнага эфекту.

Даследчыкі адзначаюць, што лейтматывам творчасці М. К. Рэрыха з'яўляецца тэма гераізму. Яна па-рознаму праяўляецца на карцінах мастака, дзе пейзажныя аб'екты набываюць абрысы энігматычных (таямнічых) рыцараў, здольных здзейсніць лёсавызначальны подзвіг. Аднак дэталі іх місіі надзейна схаваны ў таямніцах часу і гісторыі. Агульнасусветная цікавасць да мастацтва Рэрыха тлумачыцца і рэцэптыўным эфектам яго карцін: аўтар стварае вечныя сюжэты з мноствам варыянтаў іх далейшага развіцця. Такая мастацкая ўражальнасць уласціва і творам У. Караткевіча: яны надоўга пакідаюць у душы эмацыянальны водгук вітальнасці, патрыятызму і высакародства.

У казцы «Ноч» тэма гераічнага змагання раскрываецца праз фінальны паядынак таямнічага вершніка з зарой, які сімвалізуе завяршэнне яго сакральнага шляху. Аўтар так абмалёўвае гэту бітву: «Хутка зоймецца світанак, выйдзе на бойку з ноччу зара ружовая, пачне пускаць ночы ў твар сонечныя дзіды. Няроўная бойка, сцячэ цела ночы крывёй уласнаю — шэрым туманом, упадзе яно ў балоты, цёмныя лясы ды на дно глыбокіх азёр» [11, с. 590]. Пісьменнік свядома зніжае-нівелюе трагічнасць гэтых падзей для героя-пратаганіста. Больш за тое, фінальнасць успрымаецца як пазітыўны элемент — яна паказваецца як частка вечнага цыкла Быцця і як непазбежная, але неабходная з'ява. У мастацкім мысленні У. Караткевіча асабліва важную ролю адыгрывае катэгорыя амбівалентнасці — з выразным акцэнтам на здольнасці нават драматычных падзей трансфармавацца ў пазітыўны вынік.

## Заключэнне

Падагульняючы навуковыя назіранні пра пейзажныя карціны і вобразы ў казках Уладзіміра Караткевіча, варта адзначыць іх мастацкую выразнасць, арыгінальнасць і ўплыў на фарміраванне ідэйнага, тэматычнага зместу твораў, іх узбагачэнне сімвалічнымі сэнсамі. Яны дапамагаюць стварыць непаўторную атмасферу падзей, узмацняюць эмацыянальны

настрой аповеду. Дзякуючы трапнаму аўтарскаму слову звыклыя ландшафты ператвараюцца ў творах пісьменніка ў неверагодна чароўныя, фантастычныя і маляўнічыя вобразныя малюнкі. У казках У. Караткевіча пейзаж выступае як ключавы элемент мадэлі беларускага нацыянальнага свету, пры гэтым пісьменнік выяўляе шчырую, палымяную любоў да сваёй зямлі, якую разглядае як жыццёва неабходную аснову патрыятычнай ідэнтычнасці.

На ўроках беларускай літаратуры раім настаўніку запланаваць час для разгляду прыродных апісанняў у мастацкіх тэкстах. Бо, як вядома, пейзаж у літаратуры заўсёды мае некалькі функцый. Ён дапамагае стварыць фон падзей, раскрыць адметнасці сюжэтабудовы, нюансы эмацыянальна-пачуццёвага стану персанажа, спецыфіку аўтарскага светабачання і нават характар стаўлення пісьменніка да падзей, таго ці іншага героя твора. Больш за тое, аналіз пейзажных замалёвак спрыяе выхаванню эстэтычнага густу вучняў, любові да Радзімы і яе хараства, развівае агульнае мастацкае мысленне.

Так, у V і VI класах пры вывучэнні казак «Нямоглы бацька» і «Лебядзіны скіт» У. Караткевіча мэтазгодна прадугледзець заданні адпаведнай накіраванасці. Далей прапануюцца варыянты заданняў *(гл. Дадатак)*.

## Спіс літаратуры


1. *Бельскі, А. І.* Пейзаж у беларускай паэзіі (эвалюцыя, паэтыка, сістэма вобразаў) : аўтарэф. дыс. ... д-ра філал. навук : 10.01.01 / Бельскі Аляксандр Іванавіч. — Мінск, 1998. — 63 с.
2. *Драздова, З. У.* Моўна-стылёвыя праблемы эпічнага жанру 20-х гадоў: Партрэт. Пейзаж / З. У. Драздова. — Мінск : Беларус. навука, 2001. — 237 с.
3. *Шамякіна, Т. І.* Казкі беларускіх пісьменнікаў: прыгажосць і сэнсы / Т. І. Шамякіна. — URL: *https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/313312/1/9-16.pdf* (Дата звароту: 19.02.2025).
4. *Ненадавец, А. М.* Уладзімір Караткевіч: прырода, фальклор і творца / А. М. Ненадавец. — Мінск : Беларус. навука, 2015. — 423 с.
5. *Верабей, А.* Абуджаная памяць: нарыс жыцця і творч. У. Караткевіча / А. Верабей. — Мінск : Маст. літ., 1997. — 256 с.
6. *Мальдзіс, А.* Жыцце і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: партрэт пісьменніка і чалавека / А. Мальдзіс. — Мінск : Маст. літ., 1990. — 229 с.
7. *Русецкі, А.* Уладзімір Караткевіч: праз гісторыю ў сучаснасць : нататкі літ. творчасці / А. Русецкі. — Мінск : Маст. літ., 2000. — 300 с.
8. *Шынкарэнка, В. К.* Пад ветразем дабра і прыгажосці: жанрава-стылявыя асаблівасці прозы У. Караткевіча / В. К. Шынкарэнка. — Мінск : Навука і тэхніка, 1995. — 175 с.
9. *Гарадніцкі, Я.* Чалавек Рэнесансу, прадвеснік постмадэрну: мастацкі свет Уладзіміра Караткевіча / Я. Гарадніцкі. — Мінск : Звязда, 2020. — 368 с.
10. Уладзімір Караткевіч : энцыкл. / рэдкал. : В. У. Ваніна (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 2020. — 432 с.
11. *Караткевіч, У.* Збор твораў : у 25 т. / У. Караткевіч ; падрыхт. тэкстаў і камент. А. Вераб'я. — Мінск : Маст. літ., 2014. — Т. 3 : Апавяданні. Казкі: 1946—1981. — 774 с.
12. *Падстаўленка, В.* Энігматычны свет казкі «Вужыная каралева» Уладзіміра Караткевіча / В. Падстаўленка // Роднае слова. — 2022. — № 1. — С. 14—16.
13. *Stevenson, R. L.* Windy Nights / R. L. Stevenson. — URL: *https://www.chitalnya.ru/work/144146/ https://www.chitalnya.ru/work/144146* (Date of access: 10.01.2025).
14. *Рерих, Н.* Небесное зодчество / Н. Рерих. — URL: *https://rerih.org/library/3011/18* (Дата обращения: 10.01.2025).